УДК 94 (476) “1940/1980” (092)

# С. А. ВАЎПШАСАЎ: ХРОНІКА ЖЫЦЦЯ САВЕЦКАГА РАЗВЕДЧЫКА І ПАРТЫЗАНА

**В.А. Баран**, аспірант
Навуковы кіраўнік – **А.А. Савіч**, к.гіст.н., дацэнт
**Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна**

Станіслаў Аляксеевіч Ваўпшасаў – легендарная асоба ў гісторыі савецкай разведкі і партызанскага руху. Яго жыццё – гэта захапляльная хроніка подзвігаў, мужнасці, адданасці Радзіме і

непахіснай веры ў ідэалы савецкай краіны. Ён прайшоў праз агонь Грамадзянскай вайны, небяспечныя аперацыі ў Заходняй Беларусі ў 1920–1925 гг. і ўзначальваў буйныя партызанскія фарміраванні ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

С. А. Ваўпшасаў нарадзіўся 27 ліпеня 1899 г. у в. Грузджай Шауляйскага павета Ковенскай губерні (цяпер – Шаўляйскі раён Літвы) у сям'і селяніна Ваўпшаса. Бацька, літовец па нацыянальнасці, парабак па сацыяльным становішчы, працаваў да дзясятага поту, каб выбіцца з цяжкай патрэбы і забяспечыць хаця б паўгалоднае існаванне сям'і з пяці чалавек [1, с. 7]. С. А. Ваўпшасаў успамінае: "Наша семья находилась на самом низу общественной иерархии: безземельные крестьяне, да еще нерусские, инородцы, как именовались национальные меньшинства в царской России. И если наше материальное существование было сносным, то во всех остальных сферах жизни мы не могли чувствовать себя свободными и полноправными гражданами" [2, с. 8].

У ліпені 1914 г. С. А. Ваўпшасаў скончыў пачатковае народнае вучылішча і адправіўся на заробкі ў Маскву, дзе яму выдалі пашпарт з прозвішчам на рускі лад, прыпісаўшы канчатак "-аў". З таго часу ён значыўся як Ваўпшасаў. У Маскве працаваў падзённа чорнарабочым на земляных працах, потым арматуршчыкам па жалезабетоннай справе на будаўнічым заводзе "Праваднік". У 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію і ў складзе 8-й стралковай дывізіі быў накіраваны на Заходні фронт. У 1920 г. С. А. Ваўпшасаў скончыў у Смаленску курсы чырвоных камандзіраў і быў адкамандзіраваны ў распараджэнне штаба Заходняга фронту. У 1920–1925 гг. знаходзіўся на падпольнай рабоце па лініі актыўнай разведкі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. З красавіка 1920 г. па 25 ліпеня 1925 г. пад кіраўніцтвам С. А. Ваўпшасава было праведзена больш за сто складаных баявых аперацый [3, с. арк. 38–39].

Славу С. А. Ваўпшасаву як легендарнаму партызанскаму камандзіру Заходняй Беларусі забяспечыў удзел у гучных ваенна-дыверсійных аперацыях. Адна з такіх адбылася летам 1924 г. пасля таго, як дэфензіва зрабіла ў Стаўбцоўскім і Валожынскім паветах масавыя арышты ўдзельнікаў камуністычнага падполля, у тым ліку партызанскіх груп і членаў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Арыштаваныя знаходзіліся ў турме ў г. Стаўбцах і іх неабходна было вызваліць.

Выкананне гэтай аперацыі было даручана С. А. Ваўпшасаву. Ён распрацаваў план налёту на турму. У аперацыя ўдзельнічалі 54 баявыя партызаны. У ноч з 3 на 4 жніўня 1924 г. партызаны сабраліся ў лесе ў раёне Стаўбцоў. З наступленнем цемры яны падышлі да горада. Апоўначы 4 жніўня па сігналу чырвонай ракеты пачалося наступленне. На станцыі Стаўбцы першая група партызан пасля кароткага супраціўлення паліцыі і жандараў разбіла і разграміла паліцэйскі пастарунак і ахову турмы. Наглядчыкі турмы ў часе бою разбегліся, пакінуўшы ў калідорах на сценах ключы ад камер зняволеных. Былі вызвалены з агульных і адзіночных камер усе зняволеныя. Сярод іх былі два кіруючыя работнікі КПЗБ Скульскі Стэфан (сапраўднае імя Станіслаў Адамавіч Мертэнс) і Корчык Павел (сапраўднае імя Лагіновіч Іосіф Каэтанавіч), якіх на другі дзень павінны былі вывезці ў Варшаву. Другая група партызан разграміла староства і кіраўніцтва гарадской паліцыі [4, с. 16–17].

Пасля дэмабілізацыі ў 1925 г. С. А. Ваўпшасаў працаваў у Маскве ў дзяржаўным трэсце гумавай прамысловасці ў адміністрацыйным аддзеле і вучыўся на вячэрнім працоўным факультэце імя Пакроўскага на 3-м курсе. З 1927 па люты 1928 г. вучыўся ў школе ўдасканалення каманднага складу ў Маскве. Пасля заканчэння школы працаваў камандзірам асобнага ўзвода па ахове тэхнічных збудаванняў у г. Мцэнску Арлоўскай вобласці да канца снежня 1928 г. У снежні 1928 г. органамі АДПУ быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў за тое, што на банкеце ў нецвярозым выглядзе яго намеснік застрэліў саслужыўца. Адбываў пакаранне ў Салаўках і на працягу 6-ці месяцаў працаваў камендантам ваенізаванага вольнанаёмнага атрада. З прычыны асуджанасці ў 1929 г. Цэнтральны камітэт УКП(б) выключыў С. А. Ваўпшасава з партыі. У красавіку 1930 г. справу С. А. Ваўпшасава другі раз перагледзелі і ён быў апраўданы і накіраваны на аператыўную працу ў органы АДПУ-НКУС БССР у спецбюро на цалкам сакрэтную працу па падрыхтоўцы кадраў для вядзення баявой падпольнай працы ў тыле праціўніка на выпадак вайны [3, арк. 39].

Адмысловае месца ў біяграфіі С. А. Ваўпшасава займае праца ў Іспаніі ў гады Грамадзянскай вайны (1936–1939). У 1937–1939 гг. пад псеўданімамі "Шараў" і "таварыш Альфрэд" ён прымаў удзел як старшы саветнік пры штабе 14-га партызанскага корпуса рэспубліканскай арміі па разведвальна-дыверсійных аперацыях, выконваў разведзаданне ў тыле франкісцкіх войскаў. Падчас

савецка-фінскай вайны ўдзельнічаў і ў фарміраванні разведвальна-дыверсійных груп, і ў баях з праціўнікам. За паспяховае выкананне заданняў камандавання і праяўленую доблесць быў узнагароджаны ганаровай баявой зброяй [5].

У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў батальёнам мотастралковай брыгады асобага прызначэння, якая абараняла Маскву. З сакавіка 1942 г. С. А. Ваўпшасаў (партызанскі псеўданім "Градаў") – камандзір партызанскага спецатрада НКДБ СССР "Мясцовыя", які дзейнічаў у Мінскай вобласці [6, с. 217]. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 лістапада 1944 г. за ўзорнае выкананне спецыяльных заданняў у тыле праціўніка падпалкоўніку дзяржбяспекі Ваўпшасаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны С. А. Ваўпшасаў працягваў службу ў органах дзяржаўнай бяспекі. Са снежня 1946 г. ён з'яўляўся начальнікам разведвальнага падраздзялення МДБ Літоўскай ССР. У 1954 г. С. А. Ваўпшасаў звольніўся ў запас. Жыў у Маскве, дзе актыўна і шмат працаваў як пісьменнік-мемуарыст. З'яўляецца аўтарам мемуараў аб сваёй службе ў органах дзяржбяспекі і ўдзеле ў партызанскім руху ў Беларусі "Партизанская хроника" [7], "На разгневанной земле" [1], "На тревожных перекрестках. Записки чекиста" [2]. Былы член цэнтральнага кіраўніцтва, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ М. С. Арэхва у сваёй рэцэнзіі на кнігу С. А. Ваўпшасава "На разгневанной земле" адзначыў: "Книга представляет несомненный исторический и политический интерес для широкой общественности БССР. Она может вызвать интерес и в Польской Народной Республике, поскольку описываемые автором события являются составной частью революционного и национально-освободительного движения" [8, арк. 23]. Творы С. А. Ваўпшасава, заснаваныя на асабістым вопыце, унеслі значны ўклад у савецкую літаратуру аб вайне і рабоце органаў дзяржбяспекі, хоць і змяшчаюць элементы ідэалагічнай апрацоўкі, характэрныя для таго часу.

Жыццё С. А. Ваўпшасава – гэта яскравы прыклад самаахвярнага служэння Радзіме, мужнасці і выключнай адданасці сваёй справе. Яго біяграфія, якая ахоплівае перыяды падпольнай барацьбы на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1925 гг., разведвальнай дзейнасці і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, з'яўляецца каштоўнай крыніцай асэнсавання ўзброенага змагання беларусаў за сваю незалежнасць, вывучэння тактыкі партызанскай вайны і метадаў разведвальнай работы. Яго вопыт і веды, якія перадаюцца наступным пакаленням, да гэтага часу застаюцца актуальнымі. Вывучэнне яго жыццёвага шляху і дзейнасці мае важнае значэнне для захавання гістарычнай памяці і выхавання патрыятызму ў моладзі.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Ваупшасов, С. А. На разгневанной земле / С. А. Ваупшасов. – Минск : Беларусь, 1965. – 344 с.

2. Ваупшасов, С. А. На тревожных перекрестках. Записки чекиста / С. А. Ваупшасов. – М : Изд-во полит. Лит., 1972. – 464 с.

3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1099.

4. У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюц. Руху ў Зах. Беларусі / Ін-т гісторыі партыі ЦК КП Беларусі – філіял Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС ; склад. : М. С. Арэхва [і інш.]. – Мінск : Дзярж. Выд-ва БССР, 1958. – 361 с.

5. БЕЛТА : [сайт]. – Минск, 1999–2025. – URL: https://belta.by (дата обращения: 11.04.2025).

6. Твои сыновья, Беларусь! Герои Советского Союза: биографический справочник: [к 70-летию Победы в Великой Отечественной войне]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2015. – 376 с.

7. Ваупшасов, С. А. Партизанская хроника / С. А. Ваупшасов. – М : Военное изд-во Мин-ва обороны Союза ССР, 1959. – 470 с.

8. НАРБ. – Ф. 1440. – оп. 3. – Д. 1103.